# ПРАФЕСІЯНАЛІЗМЫ IT-СФЕРЫ

*Бурбоўскі Я.А.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Албут А.А. – магістр філ. навук*

Мэта даследавання – паказаць спосабы ўтварэння прафесіяналізмаў у IT-сферы. У артыкуле закранаецца тэма разнавіднасцей правапісу беларускіх прафесіяналізмаў, якія адначасова з’яўляюцца неалагізмамі. У выніку ўстаноўлена, што лексічныя неалагізмы больш распаўсюджаныя, чым семантычныя.

Прафесіяналізмы ў IT-сферы – даволі новая і не вельмі распаўсюджаная з'ява ў беларускай мове. Яе навізна абумоўлена тым, што носьбіты і творцы дадзенай лексікі – прадстаўнікі адносна маладых прафесій: праграмісты, IT-спецыялісты, вэб-дызайнеры і іншыя, звязаныя з інфармацыйнай сферай. У выніку, беларускім прафесіяналізмам у IT-сферы ўласціва доўгі час заставацца неалагізмамі.

Неалагізмы дзеляцца на семантычныя (старыя словы ў новым значэнні) і лексічныя (новыя і запазычаныя словы). На сённяшні дзень адной з крыніц неалагізмаў з'яўляецца інтэрнэт, дзе людзі, згодна з уласнымі правіламі, ствараюць аматарскія тэрміны, якія яшчэ не існуюць у мове. Таксама бывае сітуацыя, калі ў мове ўжо існуе афіцыйны тэрмін, але ён нязручны, доўгі і г.д. Тады ў ходзе зносін ён змяняецца на неалагізм, які ўжываецца больш шырока.

Семантычная неалагізмы – старыя словы, якія з часам набываюць новае значэнне. Прывядзём некалькі прыкладаў такіх слоў, распаўсюджаных у супольнасці Fandom.

1) *Люстэрка* [2] – сайт, на якім адлюстроўваецца інфармацыя з іншага сайта;
2) *Пакет* [2] – інфармацыя ў лакальнай сетцы, якая перадаецца блокамі пэўнай даўжыні;
3) *Чытанне* [2] – выбар даных з памяці прылады;
4) *Рэйка* [1, 2] – другасная калонка старонкі;
5) *Шапка* [2] – верхняя частка інтэрнэт-старонкі;
6) *Падвал* [2] – ніжняя частка інтэрнэт-старонкі.

Звычайна лексічныя неалагізмы ўтвараюцца, калі карыстальнікі спрабуюць перакласці англійскае слова на беларускую мову. Пры гэтым яны інтуітыўна выкарыстоўваюць правілы правапісу для слоў, якія ўжо існуюць. У кожнага атрымліваецца свой вынік, які залежыць ад націску ў слове і ад вымаўлення арыгінала. Часам вынік супадае, але варыянтаў напісання існуе многа. Прывядзём прыклады распаўсюджаных прафесіяналізмаў у тым варыянце, у якім яны ўжываюцца ў супольнасці Fandom.

1) *Скралбар* [1] (англ. Scrollbar) – прылада, з дапамогай якой можна пракручваць сайты;
2) *Кантэнт* [2] (англ. Content) – тое, аб чым гаворыцца ў артыкуле;
3) *Кэш* [1] (англ. Cash) – захаваныя даныя з інтэрнэт-старонкі;
4) *Рэдырэкт* [2] (англ. Redirect) – старонка з паведамленнем, што яе кантэнт цяпер знаходзіцца ў іншым месцы;
5) *Аджакс* [1] (англ. Ajax) – тэхналогія распрацоўкі скрыптоў, якія выконваюць задачы без абнаўлення старонкі;
6) *Недастаб* [2] (от англ. Stub) – дрэнны артыкул, які неабходна перапісаць;
7) *Статпад* [2] (англ. Stat pad) – вялікая колькасць бескарысных дзеянняў;
8) *Ачыўка* [2] (от англ. Achievement) – узнагарода за працу;
9) *Драпдаўн* [1] (англ. Dropdown) – спіс пунктаў, які выпадае пасля таго, як націснулі на меню;
10) *Бакграўнд* [1] (англ. Background) – фон інтэрнэт-старонкі;
11) *Інтэрспасылка* [2] (от англ. Interlink) – сувязь паміж адной і той жа старонкай на розных мовах;
12) *Хедар* [1, 2] (англ. Header) – верхняя частка інтэрнэт-старонкі;

13) *Футар* [1, 2] (англ. Footer) – ніжняя частка інтэрнэт-старонкі.

Звярніце ўвагу, што семантычныя неалагізмы пад нумарам 5 і 6 маюць сінонімы – лексічныя неалагізмы пад нумарам 12 і 13. Такое адбываецца, калі ў розных інтэрнэт-супольнасцях адначасова ўзнікае аматарскі тэрмін для абазначэння аднаго і таго ж аб'екта.

Калі параўноўваць распаўсюджанасць семантычных і лексічных неалагізмаў, становіцца відавочна, што перавага аддаецца другім. Гэта з'яўляецца вынікам таго, што сучасныя тэхналогіі былі вынайдзены і найбольш актыўна развіваюцца ў англамоўных краінах.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Fandom Developers [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://dev.fandom.com/. – Дата доступу : 08.11.2021.*
*2. Викии Вики [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://wikies.fandom.com/. – Дата доступу : 08.11.2021.*